**Зінаіда Мальцава**

**На Каляды к маці**

Нам лес стары тут казкі бае
Аб радасных і сумных днях,
Таемна ў хмарачак пытае –
Што чутна ў свеце на шляхах.

Паслухаўшы гаворак дзіўных,
Лес Тэклі песенькі пяе
Аб тых падзеях незабыўных,
Што ў сэрцы тояцца яе…

Быў палясоўшчыкам пры пане –
Ужо нябожчык – муж яе.
Сама жыццём была загнана,
Ды сыне сілы ёй дае.

Хоць Тэклі выпала на долю
Цярпець пабоі Цыпрука,
Але душой імкнулась ўволю
Аб’яць любоўю Лаўрука.

На хмаркі часта пазірала
І думы спраўджвала свае.
Як быццам штось у іх шукала:
А мо таго, што не стае?

І з цягам часу зразумела,
Каму жыццё сваё аддаць,
І з гэтай думкаю нясмела
Дзіцятка стала навучаць.

І хлопчык крочыць з маці ў поле
І ў касавіцу, і ў жніво.
Каб зразумець жаночу долю –
З ёй выпі горкае пітво.

Шчэ не было таго на свеце,
Каб матчына любоў прайшла.
К любві адкрыты ўсе дзеці,
Яна дае нам моц крыла.

Так і прайшло мо год з дзясятак.
Хлапчук з падмогаю заўжды.
Суседзі хваляць іх заўзята,
Жывецца Тэклі – не бяды!
Шчубальскі пан яго прымеціў
За спрытны розум, прыгажосць.
А ці бывала гэтак ў свеце –
Бязродны сын і ягамосць?!

Хоць бацька з маці былі рады,
Што выйдзе ў людзі іх сынок.
Ды сэрца матчына парады
Прасіла ў Бога – даць расток.

Хіба з панамі пойдзеш ў спрэчкі?
Пра панскі нораў не пытай.
Маўчы, як ціхія авечкі,
Рабі, што трэба, не бляяй.

І Лаўручок грызе навукі
Так добра, як і працаваў.
У панскім доме няма скукі,
Але ж па маці сумаваў.

Дзе ж думкі хлопца панавалі,
У чужым доме дзень пры дні?
Матулю моцна абдымалі,
Гарэла сэрца ў агні.

Вось так у душы ў адзіноце
Любоў яго расла ямчэй,
З дазволу пана, па ахвоце
Бацькам ў падмогу бег хутчэй.

Пранёсся хутка прад вачамі
Вясновых, летніх клопат час,
І зімы з доўгімі начамі
Трывожна праляцелі ўраз…

Хоць гутарлівая то баба,
Ды ў адзіноце больш жыла,

Сярод глухіх лясных прысадаў
Размову з хмаркамі вяла.

І ўсплывалі, як у фільме,
Малюнкі з песняй жаўрука,
З цяжкою працай у капцільні,
З надзеяй бачыць Лаўрука.

Іх сын вучыўся ў адвакаты.
Даўно ўжо ў горадзе жыве.
Напэўна, ужо сам багаты.
Ды штось спакою не дае…

Пісаў сынок лісты часамі
І рэдка ў вёсцы ён бываў,
Ды ўсё ж аб маці са слязамі,
Сваё жыццё ўспамінаў.

Ці даў расток тыя ўсходы,
Як зернейкі ў сваёй раллі?
Ці помніць матчыны нягоды,
Куды душу яго вялі?

Сумленне – вось судовы следчы,
Заўжды пытанні задае.
Якім прадстаць, бо я атветчык.
Што скажа сын сваёй сям'і…

А на Каляды сонца свеціць,
Іскрыстым снегам грае даль.
Сынок на свята к маці едзе,
Яго душа як той крышталь.

З любоўю маці абдымае,
Пяшчотна ў вочы ёй глядзіць.
Матулі сэрца замірае…
Цяпер са мною будзеш жыць…

Мы доўга будзем помніць свята
З яго каляднаю куццёй…
У жыцці заўсёды ёсць расплата,
А выбар – толькі за табой.